Уладзімір МАМОНЬКА

# ЯК ЖЫВЕШ, МАСТАЦКАЯ ВНУ?

У складаных грамадскіх пераплётах, якія даволі балюча кранулі кожнага жыхара краіны, акрамя тых, хто, наадварот, нечакана ўзбагаціўся на слязах і нястачах большасці, вышэйшыя навучальныя ўстановы, як ні дзіўна, зведалі не толькі горкія сцяжыны, хаця і іх давялося прайсці нямала, і хто адкажа, колькі трэба прайсці яшчэ! Тут і пастаянны, мякка кажучы, дэфіцыт фінансавання, і мізэрная аплата працы ўсіх катэгорый супрацоўнікаў, і скарачэнні штатаў, набору студэнтаў і шмат што іншае.

Але гаворку павяду ў іншым накірунку, і не таму, каб неяк абысці істотнае і балючае, а па прычыне здзяйснення многіх станоўчых фактаў у стратэгіі дзейнасці ВНУ культуры і мастацтва.

У 1991—1992 гадах, калі стала зразумела, што саюзныя магчымасці дашчэнту вычарпаны ў падрыхтоўцы мастацкіх кадраў (а трэба мець на ўвазе, што амаль усе спецыяльнасці кіно, многія тэатральныя і харэаграфічныя спецыяльнасці былі сканцэнтраваны ў Маскве і Ленінградзе), наспела вострая неабходнасць сучаснага рэфармавання галіновай вышэйшай школы Беларусі. Па-першае, на парадак дня выйшлі актуальныя настрыфікацыйныя моманты, г. зн. прызнанне нашай вышэйшай спецыяльнай падрыхтоўкі за мяжой. Так званыя інстытуты там, ва ўмовах развітога капіталізму, еўрапейскай і сусветнай практыкі, ні аб чым не сведчылі. А гэта ў сваю чаргу не спрыяла выканаўцам і спевакам, а таксама не прыцягвала да навучання ў нашых ВНУ замежных студэнтаў. Пераўтварэнне інстытутаў ва ўстановы універсітэцкага тыпу, вядома ж, не магло не крануць настальгічна настроеную частку прафесарска-выкладчыцкага персанала. Не буду называць іх кансерватарамі, хаця і гэта ў нейкай ступені было б справядліва, а скажу толькі, што гэта ў большасці выпадкаў былі пенсіянеры, прадстаўнікі так званай «легендарнай, лепшай у свеце савецкай школы».

Калі б не падтрымка ідэі абнаўлення вышэйшай школы былым міністрам культуры Яўгенам Вайтовічам і рэфармацыйна настроенымі маладымі выкладчыкамі ВНУ, уплыў якіх, вядома ж, быў значна меншы за націск «кансерватараў», не з'явіліся б у 1991 годзе пастановы Савета Міністраў аб пераўтварэнні Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута ў Беларускую акадэмію мастацтваў, у 1992 годзе — Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Луначарскага ў Беларускую акадэмію музыкі і ў 1993 годзе — Мінскага інстытута культуры ў Беларускі універсітэт культуры.

Лёд крануўся. Але колькі было папярэдніх перамоў аб увядзенні падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі па новых сучасных спецыяльнасцях ці па тых, якія на апошнім дыханні працягвала рыхтаваць белакаменная сталіца. Вынік — нуль. Напэўна, страх і постсавецкая салідарнасць, а яшчэ і «тонкае» адчуванне субардынацыі (маўляў, там, у Маскве, лепшыя, чым мы) не давала магчымасці нават крыху скрануць гэтую справу на пасяджэннях «учёных советов». Паверце, тут няма сарказму. А калі ён усё ж чытаецца, то не па віне аўтара гэтых радкоў, а па прынцыпу люстэрка, бо так было сапраўды. Загартаваныя ў барацьбе рускамоўныя кадры тытулаваных выкладчыкаў, асабліва тых, якія ў свой час прыехалі падымаць узровень культуры беларусаў, не дапускалі нават самых малых крокаў да самастойнасці, таксама як і магчымасці выкладаць на беларускай мове (пра гэта крыху пазней).

Першай зварухнулася Беларуская акадэмія мастацтваў. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што мастакі заўсёды вызначаліся трывалай самастойнасцю светапогляду і высокай нацыянальнай свядомасцю. Яны і сталі там падмуркам новаўвядзенняў. Асабліва ў працэсе беларусізацыі навучальнага працэсу. Ужо ў 1993 годзе заняткі, пасяджэнні розных узроўняў структурных падраздзяленняў БелАМ, справаводства вяліся па-беларуску.

У 1989 годзе адбыліся першыя наборы ў Беларусі па падрыхтоўцы рэжысёраў дакументальнага і мастацкага кіно. Крыху пазней пачалі рыхтаваць працаўнікоў кіно і па іншых спецыяльнасцях.

Калі клубы афіцыйна і з гонарам у святочных партыйных дакладах называліся праваднікамі палітыкі КПСС, то Мінскі інстытут культуры, напэўна, быў калі не звышправаднікам, дык, ва усякім разе, паўправадніком (калі ўжо прытрымлівацца тэрміналогіі класічнай фізікі). Спынілі б вы ў той час у інстытуцкім калідоры любога студэнта і на ваша пытанне ён, не задумваючыся, адказаў бы, што самыя галоўныя ў ВНУ кафедры — навуковага камунізму і гісторыі КПСС, а былы рэктар у прыватнай размове не прамінуў бы падкрэсліць сваё членства ў бюро РК КПБ. У інстытуце, які называўся Мінскім хіба толькі з увагі да геаграфічнага становішча, існавалі дзве «беларускія» спецыяльнасці: «культурна-асветная работа і арганізацыя народнай творчасці», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія».

Са складаным працэсам змен прэрагатыў у ВНУ (не абышлося і без спецыяльнага пасяджэння калегіі Міністэрства ў 1991 годзе з парадкам дня: «Аб ходзе выканання Закона «Аб мовах» у Мінскім інстытуце культуры») і прыходу да рэктарскага кіраўніцтва Ядвігі Грыгаровіч, пачынаючы з 1993 года, ва універсітэце пачалася падрыхтоўка кадраў па такіх спецыяльнас-

цях, як «мастацтва эстэтыкі», «харэаграфічнае мастацтва», «літаратурная работа» са спецыялізацыямі «драматургія», «кінадраматургія», «тэле- і радыёдраматургія», «рэжысура» са спецыялізацыяй «рэжысура святаў» і іншыя. Тлумачыць іх патрэбу для нашага грамадства і для нацыянальнай культуры, напэўна, лішне. Цяжка растлумачыць і зразумець адваротнае: чаму яны не былі ўведзены раней? Чаму, калі аб'яўляўся лозунг нацыянальнай падтрымкі, на самай справе рабілася ўсё наадварот?

Па прыклады далёка хадзіць не даводзіцца. Ужо колькі часу нашы бібліятэкары, якія навучаюцца ва універсітэце пяць (!) гадоў, акрамя выдатнага авалодвання мовай і літаратурай выконваюць патрабаванні навучальнага плана, які прадугледжвае выкладчыцкую кваліфікацыю. Гэта значыць, псіхолага-педагагічны цыкл, адпаведную практыку. Больш таго, з-за дэфіцыту выкладчыцкіх кадраў у школах, асабліва ва ўмовах сельскай мясцовасці, яны, як правіла, туды і запрашаліся выкладаць гэтыя прадметы. Бо ў адваротным выпадку гэта даводзілася рабіць выкладчыкам фізвыхавання. А ўзаконіць гэтую, здавалася б, відавочную з'яву, надаць ім кваліфікацыю выкладчыкаў мовы і літаратуры ўдалося толькі сёлета. А цяпер задам рытарычнае пытанне: каму стане горш ад таго, калі штогод, пачынаючы з 2001 года, навучальная практыка краіны атрымае два дзесяткі бібліятэкараў-выкладчыкаў? Прычым, асмелюся дадаць, выкладчыкаў своеасаблівых, неардынарных! Усё-такі навучанне ў творчай ВНУ адкладвае сваё непаўторнае адлюстраванне. Тое, што драматургі рыхтуюцца і, напэўна, хутка заявяць пра сябе ў кіно і тэатры, бясспрэчна. І толькі шкада, што ім некалі не выкладалі Кандрат Крапіва і Андрэй Макаёнак і іншыя знакамітыя драматургі, якія так і не пазнаёмілі моладзь са сваёй школай, і вельмі добра, што сёння да іх маюць магчымасць прыйсці Аляксей Дудараў, Віктар Тураў, Валеры Анісенка...

У гэтыя ж гады ў Беларускай акадэміі музыкі ўпершыню сталі рыхтаваць балетмайстраў-пастаноўшчыкаў, а ў Беларускай акадэміі мастацтваў сёлета адбудзецца першы набор артыстаў тэатра аперэты. Я згодзен з вядомым выслоўем, што ВНУ павінна быць кансерватыўнай у асноўнай сваёй місіі — захаванні і перадачы ведаў. Але мець у Мінску Валянціна Елізар'ева і не рыхтаваць балетмайстраў — не па-гаспадарску. Добра, што гэта разумеюць і падтрымліваюць у Міністэрстве адукацыі і навукі. Адзначаныя змены паспрыялі таму, што ў шэрагі выкладчыкаў навучальных устаноў культуры і мастацтва прыйшлі Віктар Дашук, Валеры Раінчык, Міхаіл Фінберг, Аркадзь Саўчанка, Аляксандр Анісімаў і многія іншыя дзеячы культуры, творчасць якіх ведае і любіць моладзь. А гэта не можа не спрыяць актывізацыі творчага жыцця вышэйшай школы культуры.



**Дыпломы і кветкі лепшым...**

**У Беларускім універсітэце культуры адбыўся 1-шы конкурс чытальнікаў, у якім прынялі ўдзел студэнты універсітэта. Мяркуецца зрабіць конкурс традыцыйным і прыцягнуць увагу да гэтага спаборніцтва моладзі іншых ВНУ.**

**Фота Ул. КРУКА**